**АПАВЯДАННЕ** як жанр школьнага сачынення мае на мэце паслядоўную падачу падзей. У сачыненні-апавяданні выдзяляюццца 3 часткі: завязка, кульмінацыя і развязка. Задача настаўніка – навучыць простым відам апавядання, у аснове якіх ляжыць выпадак, які адбыўся з яго аўтарам. Паступовa праца над сачыненнем-апавяданнем ускаладняецца: у ім усё большае месца займае выдумка, творчы пачатак. Методыка навучання сачыненню апавядальнага характару патрабуе строгай рэалізацыі прынцыпу паслядоўнасці.

Прадметам школьных сачыненнняў-апавяданняў у далейшым можа быць:

1) эпізод, вядомы ўсяму класу;
2) здарэнне, якое вучань назіраў або пра яго ён чуў;
3) поўнасцю выдуманая гісторыя, але якая абапіраецца на вопыт і веды вучняў.

Існуюць розныя метадычныя шляхі і прыёмы працы над апавяданнем:

1) праца над апавяданнем пачынаецца пасля вывучэння адпаведнай тэмы па літаратуры;
2) падрыхтоўчым этапам над сачыненем-апавяданнем з'яўляецца праца з сюжэтнымі малюнкамі;
3) пераход ад пераказу да апавядання на аналітычную тэму.

На пачатковым этапе навучання сачыненню ў жанры апавядання неабходна выкарыстоўваць узор з мастацкай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ